ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 21 (1095) ● Чацвер, 5 чэрвеня 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

Сёння ў нумары:

⊙ З ВУЧОНАГА САВЕТА ⊙ АБ ПОСПЕХАХ І ЗАДАЧАХ КАФЕДРЫ ПАЛІТЫЧНАЙ ЭКАНОМІІ ⊙ ШЭСЦЬ ОРДЭНАЎ НА ТВАІМ КАМСАМОЛЬСКІМ БІЛЕЦЕ ⊙ СТАРОНКА СБА ⊙ НА ВАШУ КНІЖНУЮ ПАЛІЦУ ⊙ ГУМАРЫСТЫЧНЫ ПЕРАПЫНАК

АГУЛЬНЫ КЛОПАТ

Усесаюзная навукова-метадычная канферэнцыя на тэму «АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ КПСС» пачала сваю работу ва універсітэце 27 мая. Адкрыў канферэнцыю начальнік аддзела выкладання грамадскіх навук Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР А. П. Шаптулін. З уступным словам выступіў рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі — старшыня аргкамітэта.

На канферэнцыі працавалі чатыры секцыі: методыкі ўдасканалення лекцый па гісторыі КПСС, якія чытаюцца ў ВНУ; методыкі ўдасканалення семінарскіх заняткаў і самастойнай работы студэнтаў; арганізацыі навукова-даследчай работы і грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў; методыкі прымянення тэхнічных сродкаў навучання (ТСН).

На заключным пленарным пасяджэнні 29 мая былі падведзены вынікі работы секцый і прыняты праект рэкамендацый, выпрацаваных канферэнцыяй.

У наступным нумары газеты будуць надрукаваны вытрымкі з даклада заслужанага дзеяча навукі Беларускай ССР, доктара гістарычных навук, прафесара БДУ М. Я. Шкляра «Выхаванне камуністычнай перакананасці і непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі ў працэсе вывучэння гісторыі КПСС».

БОЛЬШ ЎВАГІ ЗАМЕЖНЫМ МОВАМ

На чарговым пасяджэнні вучонага савета БДУ была абмеркавана работа кафедр замежных моў і меры па паляпшэнню вывучэння замежных моў.

З дакладам выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце У. Р. Івашын. Ён у прыватнасці адзначыў, што XXIV з'езд КПСС паставіў перад ВНУ краіны задачу паляпшэння падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для народнай гаспадаркі. Усе выкладчыкі нашага універсітэта актыўна уключыліся у выкананне гэтай задачы, у тым лiку і выкладчыкі замежных моў.

Ва універсітэце работу па навучанню студэнтаў замежным мовам вядуць чатыры кафедры: дзве — англійскай мовы, адна — нямецкай і адна — французскай і іспанскай. Выкладчыкі гэтых кафедр дабіліся нядрэнных поспехаў у рабоце, аб чым сведчыць паспяховасць студэнтаў у 1973-1974 навучальным годзе. На кафедрах падрыхтаваны рад метадычных дапаможнікаў.

Аднак у рабоце кафедр ёсць і недахопы. Трэба прызнаць, што студэнты пасля заканчэння універсітэта не ведаюць замежную мову у той меры, у якой патрабуецца. Неабходна з першых жа дзён вучобы арыентаваць студэнтаў на добрае веданне замежнай мовы.

У спрэчках па дакладу выступілі дэкан юрфака В. Ф. Чыгір, загадчык кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў А. І. Алёхіна, загадчык кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў Т. Ф. Каванава, дэкан філфака А. А. Волк, дырэктар бібліятэкі І. У. Арэхоўская, загадчык кафедры марксісцка - ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў Г. П. Давідзюк. У заключэнне выступіў рэктар БДУ У. М. Сікорскі.

Па разгледжанаму пытанню была прынята пастанова.

ДАФІНІШУ — З ВЫДАТНЫМІ ВЫНІКАМІ

Апошні у семестры званок на лекцыю заусёды успрымаецца студэнтамі па-асобаму. Разам з ім заканчваюцца практычныя, семінарскія заняткі і пачынаецца поўная хваляванняў, трывог і радасцей пара экзаменаў і залікаў.

На экзаменах усе студэнты імкнуцца максімальна паказаць свае веды і атрымаць адзнаку «выдатна». Поспех жа гэтага імкнення залежыць ад трох пераменных: ведаў студэнта, яго ўмення падаць іх выкладчыку і ад аб'ектыўнай ацэнкі ведаў экзаменатарам. Калі ўсе гэтыя параметры спалучаюцца ў адным напрамку — поспех гарантаваны. Галоўнае, канешне, два першыя моманты, дакладней, адзін — веды. Калі ёсць што паказаць, то зрабіць гэта няцяжка. Што датычыцца трэцяга — то выкладчык павінен быць заусёды аб'ектыўным, гэта яго абавязак.

Што зрабіла кафедра палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў для таго, каб забяспечыць паспяховую падрыхтоўку студэнтаў трэцяга курса да экзаменаў па палітэканоміі? Што мы можам параіць студэнтам?

Калі меркаваць па вынiках семінарскіх заняткаў, то большасць студэнтаў сур'ёзна да іх рыхтавалася. На семінарах ішло творчае абмеркаванне рэфератаў і дакладаў. Вялікае значэнне мела правядзенне тэарэтычных канферэнцый па апошняму раздзелу курса палітэканоміі капіталізму — заканамернасці манапалістычнага капіталізму і крызіс сусветнага капіталізму. Гэтыя канферэнцыі з'явіліся вынікам вывучэння курса. На кожнай з іх выступілі 12—15 студэнтаў з дакладамі. Асабліва цікава прайшлі тэарэтычныя канферэнцыі на біялагічным факультэце (падрыхтаваў дацэнт кафедры С. І. Лукашэвіч, вялікую дапамогу аказаў дэкан факультэта А. Ц. Пікулеу), на геаграфічным (падрыхтаваў дацэнт В. І. Максін). Добрае ўражанне пакінула у студэнтаў тэарэтычная канферэнцыя фізікаў, якую правялі старшы выкладчык Л. А. Дзяжураў і кандыдат эканамічных навук Э. В. Шастаковіч.

Многія студэнты у працэсе вывучэння палітэканоміі працавалі над навуковымі дакладамі для удзелу у VI Усесаюзным конкурсе студэнцкіх работ. Сярод іх студэнты трэцяга курса фізфака В. Грыгор'еў, Г. Яцэнка, А. Бялячыц, Н. Юргель, В. Немцаў; студэнты трэцяга курса факультэта пры-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ

ДОБРАЯ ПАДРЫХТОЎКА

Зусім мала часу засталося да 15 чэрвеня, дня, калі адбудуцца выбары у Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Актыўна праходзіць падрыхтоўка да выбараў у партарганізацыі юрыдычнага факультэта. Працуе агітпункт, якім кіруе выкладчык кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права В. І. Дуюн.

У агітпункце вывешаны схемы, на якіх паказана структура савецкіх органаў улады, прадстаулены кнігі, часопісы, газеты, у якіх разглядаюцца розныя пытанні жыцця нашай краіны. Ёсць літаратура, падрыхтаваная нашымі выкладчыкамі. У агітпункце чытаюцца лекцыі, праводзяцца кансультацыі.

Акрамя гэтага, рад выкладчыкаў (А. А. Галауко, А. В. Дулау, А. Т. Лейзерау) выступілі з інструкцыйнымі лекцыямі па савецкаму выбарчаму праву не толькі ў сваім агітколектыве, а і у іншых гарадах і вёсках Беларусі.

Рэспубліканскім таварыствам «Веды» падрыхтаваны і выданы дзве лекцыі па выбарчай тэматыцы: Я. М. Тагуновым — «Савецкі дэпутат», А. А. Галауко — «Саветы — сапраўдныя органы Савецкай улады». Было арганізавана пяць выступленняў па рэспубліканскаму радыё, надрукавана некалькі артыкулаў у рэспубліканскіх газетах.

У газеце «Вячэрні Мінск» журналісты В. Верабей і Н. Гарадзіевіч у артыкуле «Для тых, хто прыходзіць сюды упершыню» прааналізавалі работу трох агітколектываў Мінска. У іх ліку быў і наш агітколектыў, работа якога прызнана вельмі добраи.

Зроблена ужо многае, але наперадзе яшчэ ёсць важныя задачы. Неабходна дакладна праверыць падрыхтаваныя спісы, а галоўнае — прыняць усе меры для таго, каб выбары у Вярхоўны Савет і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных прайшлі на высокім узроўні.

Э. КАЛІНІНА.

ДА ЎВАГІ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Увагу выбаршчыкаў у бібліятэцы БДУ прыцягвае чарговая кніжная выстаўка з назвай «Насустрач выбарам». Адкрывае яе работа У. І. Леніна «Што такое савецкая улада», змешчаная побач з партрэтам правадыра.

Далей некалькі кніг У. І. Леніна, Л. І. Брэжнева, зборнік «У. І. Ленін аб сацыялістычнай дэмакратыі», «Канстытуцыя СССР», «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Савет Беларускай ССР», «Палажэнне аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных Беларускай ССР» і інш.

Больш шырока прадстаўлены адпаведныя кнігі у двух раздзелах выстаўкі: «Савецкая выбарчая сістэма» і «Выбаршчыкі і дэпутаты Краіны Саветаў».

У першы раздзел увахо-дзяць: зборнік «Актуальныя праблемы сацыялістычнага дзяржаўнага кіравання», кнігі Я. Цімошчанкі «Дэмакратыя для працоўных», Е. Рамазанавай «Органы народнай улады» і інш.

Аб рабоце дэпутатаў і аб саміх дэпутатах расказвае самы вялікі раздзел выстаўкі. Тут можна пазнаёміцца з такімі выданнямі: «Мясцовыя Саветы БССР на сучасным этапе», «Праблемы навуковай арганізацыі працы ў апараце мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных», «Пытанні работы Саветаў дэпутатаў працоўных»; «Маладому дэпутату» (Ю. Кузняцоў) і іншымі цікавымі для выбаршчыкаў кнігамі.



Вельмі напружанымі былі для супрацоўнікаў універсітэцкай прыёмнай камісіі апошнія майскія дні, калі заканчваўся прыём заяў на завочны факультэт. Значна узрастала у гэтыя дні колькасць жадаючых падаць дакументы, мяняліся конкурсы на тыя ці іншыя аддзяленні, і для некаторых абітурыентаў нарэшце закончыліся ваганні: куды ж пайсці вучыцца...

Фота Т. САХАШЧЫК.

ШЭСЦЬ ОРДЭНАЎ НА ТВАІМ КАМСАМОЛЬСКІМ БІЛЕЦЕ

ЗА ГОНАР І СВАБОДУ РАДЗІМЫ!



22 чэрвеня 1941 года.

13-я пагранзастава, камуністы, камсамольцы, беспартыйныя на чале з камандзірам А. Лапаціным і палітруком П. Гласавым уступаюць у бой з захопнікамі. «Памром, але не здадзімся!» — клянуцца байцы, апошні з якіх загіне праз дванаццаць дзён.

— Камсамольцы, за мной! — узнімае уверх ністалет намеснік палітрука па камсамольскай рабоце Рава-Рускага пагранічнага атрада малодшы лейтэнант Марк Сцепанян. Яшчэ адна контратака чырвонаармейцаў. Важак камсамольцаў падае, напатканы кулямі...

З першых жа дзён вайны тысячы маладых патрыётаў ішлі у ваенныя камісарыяты, патрабуючы залічыць іх у армію. Часта камсамольскія арганізацыі адпраўляліся на фронт усім саставам. Такіх фактаў мноства. Вось два з іх.

Тэлеграма сакратара райкома у Ленінградскі абком ВЛКСМ: «Усе камсамольцы Слащаўскага раёна ідуць добраахвотнікамі на фронт і у партызанскія атрады. Сямёнаў».

Сакратар камсамольскай арганізацыі лесапункта накіраваў у Сартавальскі райком ЛКСМ Карэла-Фінскай ССР запіску:

«...Паведамляю, што камсамольская арганізацыя лесапункта у саставе знішчальнага батальёна тэрмінова выступае на фронт. Ідуць усе камсамольцы. Аднаму даручаецца здаць справы і дагнаць нас. Просім лічыць, што наша арганізацыя знаходзіцца на фронце».

І, як у гады грамадзянскай, паяуляліся на дзвярах камсамольскіх камітэтаў надпісы: «Усе пайшлі на фронт». Так пісалі некалі бацькі, так цяпер пісалі іх дзеці.

Ішлі камсамольцы... Па заклiку Радзімы, па заклiку свайго сэрца. Ішлі на Вялікую Айчынную вайну.

З першых жа дзён вайны па усіх франтах, у абароне і наступленні савецкія воіны, сыны Бацькаушчыны, ішлі на подзвіг.

Паветраны таран... Вялікае выпрабаванне майстэрства і волі лётчыка. Моцнае жаданне не даць прарвацца ворагу, прымусіць машыну з чорным крыжам каменем упасці на зямлю... На 25-й хвіліне вайны малады пілот 46-га знішчальнага авіяпалка старшы лейтэнант Іван Іваноў, выкарыстаўшы увесь боекамплект, ідзе на таран фашысцкага самалёта. Амаль 200 паветраных таранаў было здзейснена савецкімі лётчыкамі за гады вайны, больш паловы з іх — камсамольцамі.

У самалёце — на варожыя калоны... Ясна разумееш, на што ідзеш. Гэта апошняя магчымасць нанесці праціўніку удар...

Сабой прыкрыць амбразуру... Прымусіць захлынуцца, замоукнуць варожы кулямёт. Прымусіць, нягледзячы ні на што, нават цаной свайго жыцця...

«Калі прыйдзе час выпрабавання, моладзь Савецкай Краіны дакажа, што яна заслугоувае вялікае імя Леніна, нашага бацькі, правадыра і настаўніка», — гаварыў Мікалай Астроускі. Масавы гераізм, подзвігі камсамольцаў і моладзі у Вялікай Айчыннай вайне пацвердзілі гэтыя словы. У агні баёў камсамольцы свята бераглі баявыя традыцыі свайго Саюза, памнажалі і развівалі іх.

Пройдуць гады і дзесяцігоддзі. Уступяць у жыццё новыя пакаленні савецкай моладзі. Але для кожнага з іх застанецца сімвалам высокай мужнасці, беззаветнай адданасці свайму народу. справе камунізму свяшчэнная рэліквія— скрываулены, прабіты куляй камсамольскі білет, яких многа, вельмі многа пакінула вайна.

З сярэдзіны 1943 года у будаўніцтве армейскага камсамола праходзяць значныя змены. Па рашэнню ЦК ВКП (б), прынятаму у маі, адначасова з рэарганізацыяй структуры партыйных арганізацый адпаведна змянілася і структура камсамольскіх арганізацый. Замест раней існаваўшых пярвічных камсамольскіх арганізацый у стралковых палках ствараюцца пярвічныя арганізацыі ВЛКСМ у батальёнах. У палку арганізуецца бюро на правах камітэта ВЛКСМ.

Ідэйна-арганізацыйнае умацаванне камсамола ў арміі і на флоце адыграла важную ролю у выкананні ім сваёй ролі рэзерву партыі.

«Хачу у бой ісці камуністам». «Калі загіну — прашу лічыць мяне партыйцам». «Абяцаю апраудаць давер'е». Тысячы такіх заяу камсамольцаў у партыйныя арганізацыі ведае гісторыя.

У чэрвені 1941 года ЦК ВКП(б) прыняу пастанову «Аб арганізацыі барацьбы у тыле фашысцкіх войск».

Камсамол таксама актыуна уключыуся у арганізацыю падполля і партызанскай барацьбы. Для яго гэта з'явілася новай справай, і вопыт моладзь атрымлівала пад кіраўніцтвам і пры падтрымцы партыйных камітэтаў, ваенных і іншых арганізацый. Не усё атрымлівалася адразу. Былі не толькі поспехі, але і памылкі. Камсамольцы ведалі не толькі радасць перамог, але і гора страт. Аднак, і гэта галоунае, дзейнасць камсамола ў тыле ворага атрымлівала усё большы размах.

Камсамольскае падполле... У гэтых словах увасобіліся мужнасць і стойкасць, знаходлівасць і самавалоданне, арганізаванасць і дысцыплінаванасць. За гэтымі словамі тысячы імён юнакоу і дзяучат, велізарная колькасць назвау гарадоу і вёсак.

Горад Людзінава у Калужскай вобласці, дзе змагаліся Аляксей Шумаў. Аляксандр Лясоцкі, Антаніна Хацеева. Станцыя Обаль на Віцебшчыне, што пакінула у гісторыі камсамола імены Фрузы Зяньковай, Зінаіды Партновай, Мікалая Азоліна. Падпольная арганізацыя «Партызанская іскра» у сяле Крымка Мікалаеускай вобласці. Юныя падпольшчыкі малдаускага горада Кагула. Байцы Каунаскага падполля. Краснадонская «Маладая гвардыя». Так ярка выразіліся лепшыя рысы маладога пакалення Краіны Саветау.

Камсамол актыуна дапамагау партыі у перабудове работы тыла на ваенны лад, у пераутварэнні яго у кузню савецкай зброі. Моладзь, як і увесь рабочы клас, праяуляла сапраудныя цуды працоунага гераізму. Штодзённа — самаадданая праца, якая змяніла прывычнае уяуленне аб чалавечых магчымасцях. Было цяжка, але на фронт усё у большай колькасці ішла зброя. Дзе б ні працавалі члены ВЛКСМ, маладыя патрыёты — побач з франтам ці за тысячы кіламетрау ад яго, — яны адчувалі сябе франтавікамі. Працаваць па-франтаваму, гераічна, так, як ваююць салдаты, было адзінае імкненне працоупай моладзі у тыя гады.

Радзіма высока ацаніла ролю Ленінскага камсамола у вайне. За выдатныя заслугі, за вялікую работу па выхаванню савецкай моладзі у духу беззаветнай адданасці Бацькаушчыне у чэрвені 1945 года ВЛКСМ быу узнагароджаны ордэнам Леніна. Гэта быу трэці ордэн Ленінскаму Камуністычнаму Саюзу Моладзі.



Залік па фізічнай і калоіднай хіміі лічыцца вельмі сур'ёзным у другакурснікаў біялагічнага факультэта. Таму вельмі задаволена Л. Яузрэзава, атрымліваючы залікоуку з роспісам дацэнта кафедры фізічнай хіміі Р. А. Вечар.

А для Л. Швайко залік яшчэ наперадзе.

Фота Т. САХАШЧЫК.

СПЕЦЫЯЛІСТАМ — СУЧАСНЫЯ ВЕДЫ

Ва умовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі асабліва актуальнымі становяцца пытанні якасці падрыхтоукі спецыялістау. Для выканання гэтай задачы неабходна усё больш удасканальваць формы саюза вышэйшых навучальных устаноў з навукай і вытворчасцю.

Створаная ў студзені 1966 года па ініцыятыве акадэмікаў АН БССР А. Н. Сеучанкі і А. В. Лыкава кафедра цеплафізікі БДУ па задуме павінна здзяйсняць сувязь паміж універсітэтам і інстытутам цепламасаабмену АН БССР у справе падрыхтоукі высокакваліфікаваных спецыялістау-цеплафізікаў.

Шырокая і ўсебаковая фізіка-матэматычная падрыхтоўка, атрыманая студэнтамі на фізічным факультэце, з'яуляецца фундаментам для далейшай спецыялізацыі. Яна пачынаецца з чытання спецкурсаў і правядзення спецлабараторных работ шырокага профілю. Для чытання спецкурсаў, такіх, як тэрмадынаміка незваротных працэсаў, нелінейная тэрмамеханіка, цеплавая ахова, нізкатэмпературная цеплафізіка і іншыя, запрашаюцца вядучыя спецыялісты ІЦМА АН БССР, якія непасрэдна звязаны з даследаваннямі ў гэтых напрамках. Гэта дае студэнтам магчымасць на лекцыях атрымліваць інфармацыю аб навейшых дасягненнях навукі у канкрэтных галінах.

Кафедра цеплафізікі шырока выкарыстоувае для падрыхтоукі спецыялістау навейшае абсталяванне і сучасную вылічальную тэхніку ІЦМА АН БССР. Цыклы па спецлабараторных работах праводзяцца у лабараторыях інстытута. Гэта дазваляе прыцягваць студэнтау да актыунай самастойнай дзейнасці ужо з сярэдзіны навучання. У творчым навуковым калектыве у будучага спецыяліста выпрацоуваюцца якасці сапраўднага вынаходцы.

Вялікая ўвага на кафедры удзяляецца навукова - даследчай рабоце студэнтау малодшых курсау, якім прадастауляецца магчымасць глыбей пазнаёміцца са спецыялізацыяй і паспрабаваць свае сілы пры выкананні рэфератыунай работы ці падключыцца да вырашэння некаторых эксперыментальных або тэарэтычных задач. Для студэнтау малодшых курсау арганізуюцца экскурсіі па лабараторыях ІЦМА АН БССР.

Практыка паказала, што студэнты, якія прымаюць удзел у навукова-даследчай рабоце з II—III курсаў, не адчуваюць разгубленасці і цяжкасцей пры выбары тэм курсавых работ. Для многіх з іх тэма курсавой работы аказваецца звязанай з напрамкам навуковай работы.

Большасць курсавых і дыпломных работ выконваецца студэнтамі кафедры таксама ў лабараторыях ІЦМА АН БССР і іншых акадэмічных інстытутах.

Два-тры гады, на працягу якіх студэнты праходзяць вузкую спецыялізацыю у лабараторыях ІЦМА, аказваюцца дастатковымі для іх фарміравання як даследчыкаў.

Першы выпуск спецыялістау нашай кафедры адбыуся у 1968 годзе, а сёння шэсць выпускніоў ужо кандыдаты навук і тры дысертацыі прыняты да абароны. Важна адзначыць, што з дзевяці дысертацыйных работ толькі дзве выкананы аспірантамі, а сем з'яуляюцца лагічным завяршэннем навуковых даследаванняу, пачатых яшчэ па II—III курсах навучання ва універсітэце.

Прыклад работы кафедры цеплафізікі сцвярджае, што сістэма навучання, якая арганічна спалучае у сабе вучэбны працэс і навукова-даследчую работу на базе сучасных лабараторый даследчых інстытутаў, здольна грунтоўна скараціць разрыу паміж праграмамі ВНУ і узроўнем развіцця навукі і тэхнікі. Калі спецыяльная падрыхтоука студэнтаў вядзецца непасрэдна на базе НДІ, то змена навуковага напрамку і характару даследаванняў у інстытутах цягне за сабой змену у ведах, якія набылі студэнты. У выніку выпускнікі авалодваюць навейшымі дасягненнямі у той галіне ведаў, у якой ім належыць працаваць.

А. КАСПЯРОВІЧ,
загадчык кафедры цеплафізікі.

ДА ФІНІШУ — З ВЫДАТНЫМІ ВЫНІКАМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

кладной матэматыкі О. Ільіна, М. Стрэльцын, С. Мазаніп; студэнты трэцяга курса матфака Н. Касценка, Н. Анапрыенка, Н. Ляшкевіч.

Іх даклады атрымалі высокую ацэнку навуковых кіраўнікоу і былі рэкамендаваны на універсітэцкую канферэнцыю.

Вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы да экзаменаў аказалі пастаянныя кансультацыі па першакрыніцах, правядзенне пісьмовых кантрольных работ, дадатковыя заняткі з тымі, хто не прысутнічау на семінарскіх занятках, і з адстаючымі, праверка канспектау першакрыніц.

Калектыу кафедры пастаянна сочыць за паспяховасцю студэнтау. На пасяджэнні кафедры была абмеркавана бягучая паспяховасць студэнтау па палітэканоміі на фізфаку і ФПМ. На гэтым пасяджэнні былі заслуханы не толькі паведамленні выкладчыкаў Л. А Дзяжурава, К. А. Харашуна і іншых, але і старост групы і патока, членау партыйнага і камсамольскага бюро факультэтау: М. Івановай, Л. Міхайлавай, Ю. Бальшака і іншых. Гэта пасяджэнне можна назваць своеасаблівым саветам выкладчыкау і студэнтау аб тым, як лепш падрыхтавацца да экзаменацыйнай сесіі.

Экзамены па палітэканоміі ужо пачаліся. Выкладчыкі кафедры праводзяць калектыуныя і індывідуальныя кансультацыі, актывізаваў работу метадычны кабінет кафедры. У распараджэнні студэнтаў наглядныя дапаможнікі, вучэбная літаратура, картатэка газетных і часопісных артыкулау, рашэнні з'ездаў і Пленумаў ЦК КПСС, работы К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна.

Якія ж асноўныя патрабаванні, што прад'яўляюць да студэнтаў на экзамене па палітэканоміі па тэме «Капіталістычны спосаб вытворчасці»? Першае—добра ведаць сэнс эканамічных катэгорый, адносін і законау. Не толькі вызначыць, сфармуляваць, а раскрыць сэнс, убачыць сацыяльны змест эканамічных катэгорый, класавыя супярэчнасці у капіталістычным грамадстве. Другое—вельмі важна, каб студэнты, зыходзячы з палажэнняу марксісцка - ленінскай эканамічнай навукі, умелі даць крытычную ацэнку апалагетычных тэорый сучаснага капіталізму, праявілі класавы падыход пры аналізе з'яу грамадскага жыцця капіталістычнага грамадства. Трэцяе — студэнт павінен добра ведаць першакрыніцы — работы К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна, павінен паказаць значэнне іх твораў для навуковай ацэнкі сацыяльна-эканамічных з'яу мінулага і сучаснага. Чацвёртае — неабходна ведаць спецыфіку вытворчых адносін, якія складваюцца у развіваючыхся краінах, ролю СССР і іншых краін сацыялістычнай садружнасці у змяненні суадносін сіл на сусветнай арэне на карысць сацыялізму, у барацьбе за мір і рэвалюцыйнае пераутварэнне грамадства. Такія патрабаванні прад'яўляюць выкладчыкі нашай кафедры да студэнтау. Выкананне іх — залог паспяховай здачы экзаменау.

І. ПРАХАРЭНКА,
загадчык кафедры палітычнай эканоміі прыродазнаўчых факультэтаў.

ХАЙ БУДУЦЬ ШЧОДРЫМІ РУКІ І СЭРЦЫ

ГАТОЎНАСЦЬ НУМАР АДЗІН

ПРАВЕРЫЦЬ СЯБЕ

Чаго студэнты едуць летам на будоулі? Па-першае, каб дапамагчы ўзводзіць аб'екты пяцігодкі. Па-другое, праверыць сябе на сталасць, на мужнасць.

Так ужо створаны чалавек: толькі у цяжкія для яго хвіліны ён выяўляе сябе поўнасцю, часам адкрываючы нават самому сабе невядомыя грані характару.

Яму патрэбны гэтыя цяжкія хвіліны.

Трэці семестр — час, калі мужнеюць сэрца і розум. Ты ўвесь на віду са сваімі станоўчымі якасцямі і недахопамі. Ты заціскаеш у кулак сваё маленькае «я» дзеля вялікага і мудрага «мы». Тут чалавек ацэньваецца асобай мерай — адносінамі да справы, неабыякавасцю, наяўнасцю імкнення зрабіць болей і лепш.

Работа ў будатрадах— гэта не толькі матэрыялізаваныя аб'екты. Гэта яшчэ і лагеры-спадарожнікі, і канцэрты, і дапамога мясцовым камсамольскім арганізацыям, і многае іншае. Усё, што робіцца і зроблена байцамі - б у д атрадаўцамі, можна назваць свайго роду хвалямі аднаго вялікага генератара студэнцкай актыўнасці, якая накіравана на дасягненне агульнай мэты.

Цудоўная гэта справа — студэнцкая будоўля. Праца разам. І разам адпачынак.

А. ІВАНОВА,
баец атрада «Сіняя птушка».

У канцы чэрвеня пачнуць адыходзіць ад вакзалаў студэнцкія эшалоны і аутобусы з байцамі СБА універсітэта. У гутарцы нашага карэспандэнта з начальнікам штаба працоуных спраў БДУ **Г. Блиновым**, разглядался пытанні падрыхтоучага перыяду і будучага трэцяга семестра. Такім чынам...

ПЕРАД СТАРТАМ трэба сказаць некалькі слоу аб рабоце факультэцкіх штабаў працоуных спраў. На высокім узроуні вялася работа у ШПС філалагічнага, фізічнага факультэтаў, ФПМ. Лепш, чым у мінулыя гады, папрацавалі хімікі. Малайцы! Словы папроку пачуюць гісторыкі за дрэннае выкананне распараджэнняў штаба універсітэта, прадстауленне дакументацыі не у тэрмін.

СТАТЫСТЫКА: сёлета на будоулі, пасля краіны выязджаюць 62 будатрады БДУ — 1914 чалавек. Выторчы план гэтага года — асвоіць прыкладна 3,5 мільёна рублёў капіталаукладанняу, што на 200 тысяч рублёў больш, чым у мінулым годзе. Адзін фізічны факультэт пасылае на працоуную паверку 18 атрадаў, якія абяцаюць асвоіць капіталаукладанняу на суму больш мільёна рублёў.

Ёсць змены і у **ГЕАГРАФІІ**. Упершыню на карце СБА універсітэта паявілся такія месцы дыслакацыі, як Пскоуская і Смаленская вобласці, няма Мурманска.

Упершыню заключаны дагавор аб абмене студэнцкімі будаунічымі атрадамі паміж нашай ВНУ і Іенскім універсітэтам імя Ф. Шылера. У ГДР паедуць 17 лепшых студэнтау універсітэта. Камандзір і камісар атрада —сакратары камітэтау камсамола гістфака і геафака А. Тозік і С. Субоцін. Пасланцы нямецкай студэнцкай моладзі будуць працаваць у Смалявіцкім раёне і аднасова знаёміцца з нашай рэспуолікай, яе культурнымі і гістарычнымі помнікамі.

НАРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫІ: нашы СБА падтрымалі ініцыятыву іншых ВНУ Беларусі па залічэнню у састау атрада ў якасці ганаровых членаў Герояу Вялікай Айчыннай вайны. Цяпер атрады будуць працаваць за сябе і за сваіх ганаровых байцоу — Гастэлу, Жукава, Чарняхоускага, Купрыянава, Заслонава, Амельянюка, Джалліля, Казлова, насіць імёны якіх яны заслужылі выдатнай працай, прыкладам ва усім.

ВЫХАВАННЕ у будатрадах студэнтау спалучаецца з выхаваннем рабят школьнага узросту. Гэта адбываецца не толькі у лагерах-спадарожніках, якія арганізуюць СБА. Справа у тым, што дзіцячымі пакоямі міліцыі у нашы атрады накіравана 11 падлеткаў — навучэнцаў школ і ГПТВ Мінска. Ударная працоуная дзейнасць плюс маральнае уздзеянне студэнтау павінны стаць добрым сродкам фарміравання савецкага чалавека.

ЯКІЯ Ж ВЫНІКІ? Усе атрады універсітэта прыведзены у гатоунасць нумар адзін. Складзена дакументацыя, наладжаны сувязі з месцамі будучых дыслакацый.

Напярадзе—ударны фронт работы.

Інтэратрад імя Фрыца Шменкеля — студэнты з ГДР, стажоры нашага універсітэта — выязджае летам у Малдавію.

31 мая байцы інтэратрада здавалі экзамен па тэхніцы бяспекі спецыялісту інстытута «БелНДІ гіпрасельбуд» Я. В. Шклярыку.

НА ЗДЫМКАХ: адказваюць Арвед Шылер, студэнт IV курса фізфака, і Люне Палоне, студэнтка III курса філфака; перад экзаменам трэба прагледзець канспект лекцый; камандзір інтэратрада — выпускнік ФПМ Леанід Гарадзецкі.

Фота А. ЦЫГУЛЁВА.

ЧАКАЕ ТАЁЖНЫ ПАСЁЛАК

Слова ветэрану СБА, камандзіру будатрада ФПМ «Зубронак» **Пятру МАТУСУ:**

— Больш за ўсіх СБА універсітэта укладваюць у скарбонку дзяржавы томскія атрады — каля 2 мільёнау рублёў асвоеных капіталаукладанняу. Наш атрад сёлета якраз і едзе ў Томскую вобласць у адзін з самых аддаленых яе пунктаў — пасёлак Стрэжавое. Пачынаючы з 1966 г., штогод выязджаюць сюды студэнты з розных ВНУ краіны. Можна смела сказаць, што гэта месца адваявана ў балот і тайгі рукамі байцоу СБА.

Наш атрад і іншыя атрады універсітэта будуць будаваць сховішча для гародніны, нацельню, маналітныя дарогі і іншыя аб'екты. Камісарам у маім «Зубронку» Анатоль Новікау — вы яго добра ведаеце. Завадатар, ён доугі час узначальваў культмасавы сектар камітэта камсамола ФПМ. Акрамя яго, едуць многія члены факультэцкай агітбрыгады, напрыклад, Л. Макарэвіч. Так што мяркуйце самі, сумна ці не мы будзем жыць і працаваць у Стрэжавым. І яшчэ: рабятам хочацца дапамагчы пасёлку, зыходзячы з запасу накопленых ведау. Таму ўжо зараз мы думаем аб арганізацыі кансультацыйных пунктаў па матэматыцы для школьнікаў і рабочых пасёлка.

З УСМЕШКАЙ

Як вядома, байцы студэнцкіх будаунічых атрадау — народ вясёлы і знаходлівы. Аб гэтым яшчэ раз сведчаць жартоуныя запаведзі, якімі дзеляцца з навічкамі ветэраны СБА.

1. БАЙЦОМ СБА НАЗЫВАЕЦЦА студэнт, які добраахвотна згаджаецца на два месяцы выехаць у далёкія краі.

2. ПРАЦОЎНЫ ДЗЕНЬ БАЙЦА складаецца з трох частак: даабедзеннага часу, працоунага часу, пасляабедзеннага часу, а таксама з двух асноуных заняткау: да абеда — будуе, пасля абеда — перарабляе.

3. ПЕРАД ПАЧАТКАМ РАБОТЫ распішыся у журнале па тэхніцы бяспекі. Не бойся адказнай работы. Памятай, той, хто табе яе даверыу, баіцца за цябе яшчэ больш.

4. ПАВОДЗІНЫ ПРЫ СУСТРЭЧАХ: заусёды вітайся і не размаўляй груба з першым сустрэчным — а раптам гэта начальства твайго камандзіра.

5. У СТАЛОВАЙ: міла ўсміхайся паварам, можа атрымаеш дабаўку. Не глядзі па баках — раптам вывернеш сваю міску: хто яго ведае, што з гэтага атрымаецца. З'еу сваё — дапамажы таварышу.

6. ЗАЎВАГА: не бойся камандзіра і камісара — яны таксама людзі.

РЫСЫ КАЛЕКТЫВУ

ЖАДАЮЧЫХ папасці у атрад было многа. У той дзень перад дзвярыма прафесарскай, дзе на пасяджэнні камітэта камсамола факультэта журналістыкі разглядалі заявы тых, хто хацеу стаць байцом будатрада, сабраўся вялікі натоуп студэнтау. Хваляваліся не менш, чым перад экзаменам.

— А ці праўда, што бяруць толькі з будаунічай спецыялынасцю? — з трывогай пытауся нехта.

— Дзяўчат, напэўна, Марозау возьме зусім мала, — уздыхае студэнтка з сумнымі вачыма. Гэта пра «уладара» чалавечых лёсау, студэнта III курса і будучага камандзіра будатрада Генадзя Марозава.

А будатрад не зусім звычайны. У гэтым годзе, нарэшце, збылася даунішняя і запаветная мара многіх студэнтау-журналістаў — на факультэце арганізуецца СБА. Ён будзе насіць імя Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Амельянюка, журналіста, які у гады вайны кіраваў падпольнай друкарняй і па-геройску загінуу.

Стварэнне будатрада на журфаку звязана з пэўнымі цяжкасцямі. Першая і галоуная з іх — гэта перанясенне практыкі, якую па вучэбнаму плану студэнты I—III курсаў павінны праходзіць у лютні. Па-другое, факультэт наш невялікі, і стварэнне атрада у нейкай меры ускладняе выкананне ім плана па адпраўцы студэнтау на сельгасработы. Гэта — клопат дэканата. А для байцоў галоуныя турботы цяпер вызначае сесія. Яе абавязкова трэба паспяхова здаць, нягледзячы на скарочаныя тэрміны. А тое, што у адрозненне ад іншых у нас практычна не будзе адпачынку ў звычайным сэнсе гэтага слова, нікога не хвалюе. Наадварот, рукі многіх, я ведаю, нецярпліва чакаюць таго моманту, калі яны будуць трымаць кельму.

У падрыхтоучы перыяд работы атраду хапае. Здалі экзамен па тэхніцы бяспекі, выпусцілі атрадную газету. А колькі клопату было з афармленнем вучэбнага палігона для заняткау па падрыхтоуцы будатрадаўцаў! Гэта было пачэснае даручэнне нашаму атраду. У паўсядзённых клопатах і справах адбываецца параджэнне калектыву. Іменна цяпер ставіцца пытанне: якім ён будзе?

Наш строгі і дзелавіты камандзір, удзельнік працоуных семестрау-73 і -74, у першую чаргу патрабуе дысцыпліны. Калі назначаны сход атрада — кожны павінен абавязкова прысутнічаць; калі ты атрымаў даручэнне — ты выканаеш яго у тэрмін і самым належным чынам. Інакш не можа быць. Бо асновы строгай атраднай дысцыплины, па законах якой мы будзем жыць (нездарма ж называемся байцамі), закладваюцца зараз, пакуль мы яшчэ дома. Там, на аб'екце, будзе цяжэй, і кожны павінен выхаваць у сабе пачуццё адказнасці за свае учынкі. Дарэчы, патрабаванне дысцыплінаванасці зусім не у цяжар нашым «ветэранам». Яны — ядро атрада, апора камандзіра, той прыцягальны цэнтр, вакол якога ўсе мы аб'ядноуваемся, на які мы, і мусіць няма такой работы, якая была б не знаёма яму. Ён сам заусёды знаходзіць яе, бачыць, дзе і што можна зрабіць. Разважлівы і дзелавіты у жыцці і рабоце Саша Андрэеу; хуткі, гатовы адразу ж выканаць любое даручэнне Лёня Ракавец.

Я пішу, як яны працуюць, бо ўжо бачыла іх за работай, бачыла, як яны задаюць тон астатнім. Два дні працаваў атрад на будаўніцтве памятнага Знака студэнтам і выкладчыкам універсітэта, якія загінулі у гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта была першая прыкідка сіл, першая праверка атрада, яго здольнасцей. Як працаваў атрад — я не буду ацэньваць. Хачу толькі сказаць, што такога задавальнення ад работы многія з нас раней не адчувалі.

У той жа дзень, адразу пасля суботніка, на факультэце вісеў новы выпуск «Камсамольскага пражэктара», у якім расказвалася аб рабоце атрада. У ім — удзячныя словы грамадскіх арганізацый БДУ.

Калі мы яшчэ працавалі на будаўніцтве Знака, нехта зазначыу: «Малайцы, журналісты! Нездарма вас у Томскую вобласць накіравалі». Сапраўды, атрад, які толькі што стварыуся, едзе у Томскую вобласць, куды пасылаюцца звычайна вопытныя, спрактыкаваныя, загартаваныя атрады. І гэта, вядома, накладвае на нас вялікую адказнасць.

Мы едзем не за туманам. Едзем працаваць. Па дагавору атраду трэба асвоіць 17 тысяч рублёу капіталаўкладанняу.

Ну і, вядома, недзе у глыбіні душы жыве жаданне (я скажу пра тых, хто едзе першы раз) паспрабаваць сябе, убачыць, на што ты здольны. Усё ў нас напярадзе.

Л. ЛАБАЧЭЎСКАЯ,
баец СБА імя У. Амельянюка.

ЧЭРВЕНЬ

1 ЧЭРВЕНЯ — Міжнародны дзень абароны дзяцей.

3 ЧЭРВЕНЯ — 100 год з дня смерці Жоржа Бізэ (1838—1875), французскага кампазітара.

4 чэрвеня — 90 год з дня нараджэння Я. М. Свярдлова (1885—1919), дзеяча Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы.

5 чэрвеня — 6 год з дня адкрыцця ў Маскве міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый.

6 ЧЭРВЕНЯ — 80 год з дня нараджэння М. А. Шчорса (1895—1919), героя грамадзянскай вайны.

7 ЧЭРВЕНЯ — 1971—створана першая ў свеце савецкая арбітальная пілатуемая навуковая станцыя «Салют» шляхам стыкоўкі станцыі «Салют» і транспартнага карабля «Саюз-11». Палёт станцыі, якую пілатаваў экіпаж у саставе касманаўтаў Г. Ц. Дабравольскага, У. М. Волкава і В. І. Пацаева, працягваўся 24 суткі.

8 ЧЭРВЕНЯ — Дзень работнікаў лёгкай прамысловасці.

15 ЧЭРВЕНЯ — Дзень медыцынскага работніка.

19 ЧЭРВЕНЯ — 5 год назад (1970) быў паспяхова закончаны васемнаццацісутачны арбітальны палёт касмічнага карабля «Саюз-9», які пілатавалі касманаўты А. Р. Нікалаеў і В. І. Севасцьянаў.

22 ЧЭРВЕНЯ — 1941—вераломны напад фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза супраць фашысцкай Германіі.

24 ЧЭРВЕНЯ — 30 год назад (1945) на Краснай плошчы у Маскве адбыўся Парад Перамогі.

25 ЧЭРВЕНЯ — 70 год з дня нараджэння (1905) П. У. Броўні, народнага паэта Беларусі.

27 ЧЭРВЕНЯ — 70 год з дня пачатку (1905) паўстання матросаў на браняносцы «Пацёмнін».

29 ЧЭРВЕНЯ — Дзень савецкай моладзі.



НА ВАШУ КНІЖНУЮ ПАЛІЦУ

У выдавецтве БДУ у 1975 годзе выйшлі з друку наступныя кнігі: **П. П. Шуба.** Лекцыі па беларускай марфалогіі; **Л. А. Шаўчэнка, М. М. Пішчанка, У. С. Карабан.** Дапаможнік па рускай мове і літаратуры для паступаючых у ВНУ; **Пытанні гісторыі КПСС.** Міжведамасны зборнік; **В. Н. Калмыкоў.** Інтэлектуалізацыя сацыялістычнай сельскагаспадарчай працы; Ленінскі план пабудовы сацыялізму і яго ажыццяўленне у СССР. **Пад рэд. У. М. Сікорскага.**

С. Н. Чубакоў. Слова і зброя. У гэтай кнізе на гісторыка-літаратурным матэрыяле XVIII—XIX ст. прасочваецца працэс станаўлення антываенной традыцыі ў творчасці рускіх пісьменнікаў-класікаў, аналізуецца мастацкая своеасаблівасць іх твораў аб вайне. Разглядаецца таксама пытанне аб уздзеянні іх гуманістычнага пафасу на развіццё тэмы міру і вайны у сучаснай літаратуры.

М. У. Піскуноў. Навучанне і праца навучэнцаў. У кнізе на аснове вялікага тэарэтычнага і эксперыментальнага матэрыялу (пераважна са школ БССР) аналізуецца сувязь вывучэння агульнаадукацыйных прадметаў з працоўным навучаннем і працоўнага навучання з вывучэннем агульнаадукацыйных прадметаў у савецкай школе. Значнае месца адводзіцца пытанням выхавання ўсебакова развітой асобы.

А. С. Прадвадзіцеляў. Механіка рухаў; **М. С. Корзун.** Сацыяльна-палітычная барацьба у Афінах у 444—425 гг. да нашай эры; **Л. А. Царанкоў.** Французскі Скарына і яго час; **А. М. Дзенісенка.** Навукова - тэхнічная рэвалюцыя у сельскай гаспадарцы: упраўленне, кіруючыя кадры.

Д. Б. Мельцар. Савецка-балгарскія адносіны 1917—1935 гг. У кнізе прасочваюцца вытокі і развіццё савецка-балгарскіх адносін як комплексу міждзяржаўных, эканамічных і культурных сувязей, раскрываецца сутнасць міралюбівай палітыкі Савецкай дзяржавы, накіраванай на нармалізацыю адносін з Балгарыяй, ад першых кантактаў савецкіх і балгарскіх прадстаўнікоў у Брэст-Літоўску у 1917 г. да устанаўлення дыпламатычных адносін у 1934 г.

Н. Ф. Куляшова. В. Г. Тан-Багараз; **М. Д. Каўшарау.** Працоўныя папяровай прамысловасці Беларусі у барацьбе за перамогу сацыялізму у СССР; **Л. І. Бурак.** Прымыканне у сучаснай беларускай мове.

М. Г. Жаркоў. Супраць буржуазных фальсіфікацый гісторыі Кастрычніка. У ФРГ і іншых капіталістычных краінах паяўляецца многа работ буржуазных гісторыкаў, звязана фальсіфікуючых гісторыю Кастрычніка, прадстаўляючых велізарнейшыя падзеі нашай эпохі як чыста «рускую» з'яву, якая не мае нічога агульнага з развіццём сусветнага гістарычнага працэсу. Крытыцы вымыслаў сучасных буржуазных і правасацыялістычных гісторыкаў прысвечана гэта праца.

І. А. Матусевіч. Вывучэнне асобы абвінавачваемага у працэсе папярэдняга дазнання; **Калектыў аутараў.** Пытанні гісторыі; **В. В. Ізох, А. С. Ключнікаў, М. І. Кірыла, В. П. Сідаровіч.** Лабараторныя работы па галаграфіі; Палітычная эканомія капіталізму. **Пад рэд. І. Т. Рагоускага; М. А. Беразовін, Я. Л. Каламінскі.** Настаўнік і дзіцячы калектыў. У манаграфіі разглядаюцца педагагічныя і сацыяльна - псіхалагічныя праблемы кіравання дзіцячым калектывам, роля настаўніка у жыцці класа. На аснове эксперыментальнага даследавання аналізуецца уздзеянне стылю кіраўніцтва калектывам на адносіны паміж навучэнцамі.

В. ЖДАНОВІЧ.

Дырэктар выдавецтва БДУ Л. А. Севасцьянчык, загадчык вытворчага аддзела П. М. Сцяржанаў і выпускаючы М. М. Шахавец абмяркоўваюць новыя кнігі. Кнігі, якія выйшлі з друку у выдавецтве БДУ у 1975 г.

ГУМАРЫСТЫЧНЫ ПЕРАПЫНАК

МЯСЦОВАЯ ХРОНІКА

У сталовай у чарзе за кісялём пазнаёміліся студэнты Максімаў і Кузняцоў. Якая ж была у іх радасць, калі выявілася, што яны абодва вучацца на адным факультэце, на адным курсе і у адной групе!

●

Заява: крышталёвы кубак, уручаны мне як пераможцу спаборніцтваў, прашу абмяняць на эмаліраваны чайнік.

●

Не балбачы на лекцыі. Памятай: слова — не верабей, зловяць — вылеціш.

●

Аб'ява: выкладчыкам, якія прымуць сесію толькі на «добра» і «выдатна», будзе назначана стыпендыя.

●

Грошай куры не клююць, нават галодныя, — такі вывад зрабіў аспірант Цюцюлькін пасля трохгадовага эксперыменту.

●

Апошняе навуковае «адкрыццё»: атам складаецца з пратонаў, электронаў і ньютонаў.

●

Чаго не зразумеу на лекцыі — даведаешся на экзаменах.

БЛАТФОРМА

Я крыху крыуджуся на прыроду. Не на тую прыроду у поуным сэнсе гэтага слова, а на прыроду майго маленькага росту. Мяркуйце самі: я малады чалавек, а рост маю «жаночы» — 1 м 65 см. І кожны мужчына такога росту зразумее прычыну майго гора. Шкада толькі, не разумеюць мяне дзяучаты. Ні для каго не сакрэт, што яны любяць высокіх хлопцаў. Гэта толькі ў песні яны могуць спяваць «я люблю чалавека невысокага росту», а як на самай справе гэта адбываецца — спытайце у нашага братакаратыша.

Але аднойчы да мяне прыбег мой сябра, вочы яго радасна ззялі. Меў бы я рост, як у яго—1 м 80 см,—у мяне наогул вочы заусёды б радасна ззялі.

— Прывітанне, стары! — крыкнуу ён мне з парога.— Не сумуй, я знайшоу для цябе верны сродак. Лічы, што праз пару дзён ты падрасцеш адразу на 6—7 см.

— Здзекуешся, — сказау я.

— Ніколькі. Мода зараз ідзе табе насустрач. Слова «платформа» табе аб чымнебудзь гаворыць?

— Ха! Платформа... Ты што, забыуся, як мы былі ў калгасе на сельгаспаботах і нам часта даводзілася разгружаць гэтыя платформы: то з камбікормам, то з угнаеннем. Так што аб платформах ты мне больш не заікайся, яны у мяне да гэтага часу у пячонках «сядзяць».

— Э, не аб той платформе ідзе размова! Ведаеш, на чым цяпер жанчыны стаяць і ходзяць? На платформе.

— Ты што, вырашыу зрабіць з мяне жанчыну?!

— Ды пастой ты, не гарачыся. Справа у тым, што гэту платформу носяць цяпер і хлопцы. Значыць, для цябе праблема нумар адзін—гэта раздабыць платформу.

— Што ж, буду цяпер кожны дзень забягаць у «Чаравічкі».

— Баюся, што з «Чаравічкамі» у цябе нічога не атрымаецца. Ёсць у мяне адна знаёмая, якраз працуе у аддзеле мужчынскага абутку.

Прыйшлі да яе. Расказалі. Мауляу, так і так. Выручай. Гібне чалавек.

Ківае галавой.

— Разумею, — кажа. — У нас цяпер гэтага дэфіцыту няма, але я вас пашлю да сваёй знаёмай у другі магазін.

Праз гадзіну стаім ля прылаука другой «феі». Кіунула яна на мяне і гаворыць:

— Што ж, лічы, што табе пашанцавала. Бяжы хутчэй у гастраном за «бульбай», а чаравікі зараз вынесу.

І вось праз пару хвілін, усміхаючыся, «фея» прынесла іх, ну, гэту пару імпартных чаравікау, як іх... блатформу.

Зараз я ужо 1 м 72 см, а гэта ужо тое-сёе. А учора хадзіу у Палац культуры на вечар адпачынку Пазнаёміуся з дзяучынай. Прыгожая. Платформы, здаецца, не зауважыла. Пакуль не позна, буду сватацца.

Я шчаслівы!

Э. ЭЛЬКСІН,
студэнт II курса завочнага факультэта аддзялення журналістыкі.

ЛІСТОК ДАІ

ЖЫЦЦЁ ПАД ПАГРОЗАЙ

«Не шанцуе» некаторым пешаходам на вуліцы: то часу не хапае, то трамвай перашкаджае, то недарэчы ў самы непадыходзячы момант светафор уключае трывожны чырвоны сігнал...

А пешаходы ж у пераважнай большасці ідуць па тэрміновых справах: на працу, у магазін, на лекцыю... І вось атрымлваецца: рух замарудваецца таму, што ўсім хочацца ехаць або ісці хутчэй! Парадокс!

Практыка інспектараў дарожнага нагляду сведчыць аб тым, што яшчэ значная колькасць пешаходаў не ў згодзе з бяспекай руху. З пачатку года, дакладней, за чатыры месяцы года толькі ў Мінску мы затрымалі і аштрафавалі 45.348 пешаходаў. Гэтыя людзі пераходзілі дарогу не па правілах дарожнага руху, ствараючы небяспечнае становішча, ставячы жыццё сваё і іншых пад пагрозу.

Надышоў час павышанай інтэнсіунасці руху на дарогах. Асабліва гэта адчуваецца у гадзіны пік. Дарожны рух штодзённа прыносіць мноства трагедый, вялікіх і малых. І сваімі паводзінамі кожны з вас можа актыуна ўплываць на зніжэнне колькасці дарожных здарэнняў.

В. АНАНЬІН,
супрацоўнік ДАІ УУС Мінгарвыканкома, маёр міліцыі.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2 000 экз. Рэдактар
Аб'ём — 1 друк. ар. АТ 04752. Заказ № 918. А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.